Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№ 69 (28433)

12 КРАСАВІКА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12



**Хутар пад знос**

МС



**Будні сельскага доктара**

МС



**Як павысіць урадлівасць глебы?**

СТАР. 16

# Час рупіцца і працаваць

## ПРЭЗІДЭНТ ПРА ПАСЯЎНУЮ, МАДЭРНІЗАЦЫЮ ДРЭВААПРАЦОЎКІ, БІЗНЕС І ПАДЗЕІ Ў СВЕЦЕ

**Падчас рабочай паездкі ў Гомельскую вобласць кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на дзве тэмы. Першая — традыцыйная для вясновай пары — пасяўная кампанія. Другая — стан і перспектывы развіцця дрэваапрацоўчай галіны, у мадэрнізацыю якой дзяржава ўкладвае істотныя сродкі.**

Аляксандр Лукашэнка, знаёмячыся з ходам вясновых палявых работ у саўгасе «Выток» Рэчыцкага раёна, цікавіўся, ці дастаткова сховішчаў для насення, якія ёсць праблемы па пасяўной, ці хапае мінеральных угнаенняў, паліва. Кіраўнік дзяржавы асабліва закрануў тэму эканомнага і беражлівага стаўлення да рэсурсаў. «Давядзіце да ўсіх: эканомія павінна быць вельмі жорсткай, — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка. — Навядзіце парадак са спажываннем паліва». Што да мінеральных угнаенняў, то павінна быць тэхналагічная дысцыпліна іх выкарыстання. Каб каштоўныя дабаўкі не гінулі дарма, іх неабходна выкарыстоўваць строга па правілах — у патрэбны час.

Для знаёмства з ходам мадэрнізацыі ў сферы дрэваапрацоўкі Аляксандр Лукашэнка наведаў прадпрыемства «Рэчыцадрэў», дзе пакуль адпаведныя працэс не завяршыўся.

СТАР. 2

# ДЗВЕ СОТНІ КРЫЛАЎ

**У галубятні, якую жыхар Пружан Сяргей БУЗА пабудаваў у двары свайго шматпавярховага дома ў цэнтры горада, сёння жыве каля сотні птушак. Сяргей прызнаецца, што гэта яго спраўджаная мара дзяцінства. Любоў да жывых істот ён перадаў і сваім сынам: старэйшы працуе кінолагам, малодшы — вучыцца на ветэрынара. Цікавяцца птушкамі і клопатам пра іх і суседскія хлапчукі.**



Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр ПРАКАПОВІЧ, старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва:**

*«Рабочая група, створаная па рашэнні кіраўніка дзяржавы ў мэтах стымулявання дзелавой актыўнасці і выключэння залішніх патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да суб'ектаў гаспадарання, а таксама для далейшага ўдасканалення кантрольнай і наглядная дзейнасці, зрабіла каласальную работу. Рашэнне аб накіраванні на грамадскае абмеркаванне новых дакументаў яшчэ больш прыцягне ўсіх прадпрымальнікаў, дзелавых людзей, эканамістаў. Усе ахвотныя змогуць унесці свае прапановы. Спадзяюся, што ў выніку такога абмеркавання і з улікам напрацаваных матэрыялаў мы атрымаем вельмі добрыя нарматыўныя дакументы, якія будуць стымуляваць развіццё эканомікі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.04.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8966 | ▼ |
| Еўра | 2,0085 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0333 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0705 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17069>

■ Блізкі космас

# БЕЛАРУСКІ КАРАЛЁЎ

## Як кіруюць айчынным спадарожнікам сувязі?

**Больш за год таму Беларусь займела ў касмічнай прасторы сваё другое «прадстаўніцтва» — спадарожнік Белінтэрсат-1 быў выведзены на арбіту кітайскай ракетай-носьбітам «Чаньчжэн-3В» (у перакладзе — «Вялікі паход»). Ад першага айчыннага касмічнага апарата ён адрозніваецца кардынальна. У першую чаргу па прызначэнні, задача сатэліта — аказваць тэлекамунікацыйныя паслугі: спутнікавае тэле- і радыёвяшчанне, доступ у інтэрнэт... Для кіравання спадарожнікам у вёсцы Станькава быў створаны наземны комплекс кіравання і невялікі «касмічны гарадок». Напярэдадні Дня касманаўтыкі карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў «беларускім Каралёве» і паназіралі, як апаратам паспяхова кіруюць нядаўнія студэнты.**

СТАР. 4



Усе антэны скіраваны ў бок экватара — менавіта там знаходзіцца беларускі спадарожнік сувязі.

Фота Надзеі БУЖАН.

# «ПАРАТРУПЕР» — БУДЗЕ СУПЕР?




**У красавіку пачнуць працаваць атракцыёны. Ці ўсе з іх парадуюць шматтысячную армію наведвальнікаў? Зараз работнікі Дзяржпрамнагляду інспектуюць беларускія забаўляльныя машыны. Бо толькі той агрэгат, які спраўны на 100%, зможа атрымаць допуск да работы. Аб тым, што хаваецца па іншы бок забаўляльных канструкцый, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з галоўным дзяржаўным інспектарам упраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў Дзяржпрамнагляду Сняжанай КАЗАЕВАЙ.**

## 5 метраў у секунду

У маі 2009 года нагляд за атракцыёнамі быў перададзены дэпартаменту па ўказанні Прэзідэнта. Але не за ўсімі. Тэхнічныя характарыстыкі рэгламентуе п. 6 дадатка 2 Закона «Аб прамысловай бяспецы». Напрыклад, сярод механізаваных агрэгатаў інспектары Дзяржпрамнагляду сочаць за тымі, якія рухаюцца па гарызанталі з хуткасцю, большай за 3 метры ў секунду для дзіцячых атракцыёнаў і 5 — для дарослых. Для тых жа, якія падымаюць наведвальнікаў угару, таксама ўстаноўлены ліміт: канструкцыі, якія ўзнімаюцца на вышыню больш за 2 метры для дзіцячых і 3 — для дарослых. А водныя горкі трапляюць на дзяржаўны ўлік тады, калі пасажыры на іх разганяюцца больш за 5 метраў у секунду, і калі адносная вышыня спуску на іх больш за 3 метры.

## Наколькі высокі знос?

156 з 269 падкантрольных нам канструкцый па ўсёй краіне ўжо перайшлі мяжу нарматыўнага тэрміну эксплуатацыі. Для кожнага атракцыёна вызначаны свой паказчык. Увогуле межы яго складаюць ад 10 да 25 гадоў. Што адметна, па працэнтных суадносінах тут лідзіруюць перасоўныя атракцыёны. «На пенсію» надышоў час адправіць 34 з 39 такіх канструкцый, якія былі выпушчаны яшчэ ў 1990-х гадах. У лічбавых жа суадносінах пальма першынства належыць механізаваным канструкцыям. Такіх набіралася 116 са 195. Цікава, што самы стары атракцыён у Беларусі працуе ажно з 1963 года! Гэта кола агляду ў Бабруйску. Па адным «ветэране» з савецкіх часоў засталося дагэтуль у Гомелі і на Мiншчыне.

СТАР. 3